Зоя Трацціяк,
ПДУ, Полацк

“ВАЙНА ПАКІДАЕ Ў ПІСЬМЕННІКА РАНУ…”: ТВОРЧЫЯ ПОШУКІ Э. ХЕМІНГУЭЯ І В. БЫКАВА

В. Быкаў у кнізе «Доўгая дарога дадому» адзначыў, што «культура – мора, бязьмежны акіян, назапашаны чалавецтвам праз тысячагоддзі» [1, с. 168]. Напрыканцы жыцця пісьменнік вылучыў шэраг «астравоў», да якіх ён прычальваў у розныя гады. Адным з іх быў востраў, які ўвасабляў творчасць нобелеўскага лаўрэта Э. Хемінгуэя.

У 60 – 70-я гг. XX ст. айчынныя літаратары, як і шырокая савецкая чытацкая аўдыторыя, з цікавасцю знаёміліся са спадчынай амерыканскага пісьменніка. Уражвала легендарная постаць празаіка, які паўдзельнічаў у дзвюх сусветных войнах і шэрагу лакальных узброеных канфліктаў, добра адчуваў сябе ў багемным Парыжы і на Кубе, захапляўся паляваннем, рыбалкай і карыдай. Асобна гаворка ішла пра вартасці яго твораў і публіцыстыкі, у прыватнасці пра «прынцып айсбергу» і лаканічны выклад уласных думак.

Спакутаваныя пільнай савецкай цэнзурай, беларускія пісьменнікі захапляліся раскаванай манерай аповеду Э. Хемінгуэя. Адзначым, што часам грамадска-палітычная сітуацыя, чытацкія запатрабаванні, заўвагі «добрапрыстойных» крытыкаў карэктавалі працу творчай лабараторыі амерыканскага пісьменніка. Прыходзілася змагацца за права карыстацца табуіраванымі лексічнымі адзінкамі ў выпадку, калі яны дапамагалі рэалізаваць мастацкую задуму: «я звяртаюся да словаў, выключаных са старонак кніг… [мая дзейнасць] не мае нічога агульнага з прыгодамі хлопчыка, што піша крэйдай на плоце словы, пра якія ён толькі што даведаўся» (*my use of words which have been eliminated from writing ... has nothing to do with the small boy chalking newly discovered words on fences*) [4, p. 381].

Празаік неаднаразова каментаваў-тлумачыў тэматыку твораў, звязаную з трагічнымі і ганебнымі старонкамі быцця чалавецтва: «Ва ўсіх сваіх гісторыях я спрабую данесці пачуццё рэальнасці, не проста адлюстраваць жыццё, ці крытыкаваць яго, а на самой справе ажывіць яго... Ажыццявіць гэта магчыма толькі ўвасобіўшы як дрэннае і звыроднае, так і прыгожае… » (*I’m trying in all my stories to get the feeling of the actual life across – not to just depict life – or criticize it – but actually make it alive. ...you can’t do this without putting in the bad and the ugly as well as what is beautiful*) [4, p. 153]. Сюжэты, звязаныя з гвалтам, забойствамі, існаваннем цялеснай абалонкі чалавека, шакіравалі патэнцыяльнага чытача, выхаванага ў поствіктарыянскай цнатлівасці. Э. Хемінгуэй не раз абмяркоўваў сітуацыю з М. Перкінсам,

спрабуючы знайсці выйсце: пісьменнік усё ж матэрыяльна залежыў ад продажаў кніг, таму ён не мог назаўжды забыцца на пануючыя густы.

Паказальна, што В. Быкаў таксама змагаўся з цэнзарамі розных гатункаў не толькі за магчымасць падаваць «акопную праўду», але і за права пісаць, карыстаючыся сакавітым родным словам: «Першы мой пісьменніцкі канфлікт быў менавіта ў галіне мовы, якая… не адпавядала выдавецка-рэдактарскім канонам» [1, с. 169].

Празаікі прайшлі этап літаратурнага вучнёўства, ім спатрэбіўся час, каб знайсці ўласную ўнікальную манеру аповеду пра падзеі Першай і Другой сусветных. Асобныя спробы занатаваць перажытае звязаны з лістамі Э. Хемінгуэя з Італіі (датаваны 1918 г.), аповесцю «Апошні баец» і некаторымі апавяданнямі В. Быкава. Пазней мастакі слова даволі крытычна выказваліся наконт гэтай спадчыны, негатыўна ацанілі рамантычна-ўзнёслую канцэпцыю вайны. Відавочнымі для іх былі другаснаць створанага, яго ангажаванасць, скіраванасць на папярэднюю літаратурную традыцыю, масавыя запатрабаванні. Значна тое, што занатаванае стала ў абодвух выпадках пачаткам аўтарскай эвалюцыі.

Амерыканскі і беларускі пісьменнікі разглядалі вайну як неад’емны кампанент быцця ў першай палове XX ст. Падзеі аднаго ўзброенага канфлікту паступова пераходзілі ў другі, утваралі своеасаблівы кантынуум. Э. Хемінгуэй здолеў увасобіць Першую сусветную, грэка-турэцкае проціборства, Грамадзянскую вайну ў Іспаніі, Другую сусветную. Удзел у кожным наступным супрацьстаянні расквечваў светапогляд празаіка новымі колерамі: ад захаплення «ганаровага лейтэнанта» авантурай-гульнёй да расчаравання і адмаўлення крывавай бойні ветэранам.

Адзначым, што матыў вайны-гульні «праслізнуў» у творчасці беларускага мастака слова. Сімптаматычным нам падаецца апавяданне «Эстафета». Калі хемінгуэеўскія героі засяродзіліся на займальнасці, карнавальнасці і відовішчнасці баявых дзеянняў, што выпадкова выходзілі з-пад кантролю, то персанажы В. Быкава адразу адчувалі жорсткасць і жахлівасць правіл, якімі яны кіраваліся на фронце.

Па аповесцях беларускага пісьменніка раскіданы згадкі пра руска-японскую, Першую сусветную, грамадзянскую, савецка-польскую і савецка-фінляндскую войны, Вялікую Айчынную. Празаік ахарактарызаваў перыяд з 1905 па 1941 гг. так: «кожны год дзе-небудзь на свеце ішла вайна, дзяржавы, што не ваявалі, з усяе сілы рыхтаваліся да таго… кавалася зброя, фарміравалася ўсялюдская злосць, рыхтавалася навуковае абгрунтаванне будучай бойні і раслі салдаты будучых рот, батальёнаў, палкоў…» [2, с. 348]. Бачна, што падзеі мінулага – гэта і памяць родных, знаёмых, і грунт, на якім адбывалася сталенне і самога празаіка, і яго персанажаў. Гэта аснова заўсёды негатыўна афарбавана, бо катаклізмы мінулага радыкальна адбіліся на асабістых лёсах беларусаў (прадстаўнікоў шматпакутнай нацыі). Так

нарадзілася своеасаблівая эстэтыка адмаўлення мілітарызма, што мацнела ад твора да твора В. Быкава.

Кровапраліцце здавалася непазбежным, бязлітасным і бясконцым, але мастакі слова ўвасобілі вобраз чалавека, які свядома ішоў да загадкавага і жудаснага ‘nada’. Роберт Джордан («Па кім звоніць звон») і лейтэнант Іваноўскі («Дажыць да світання»), напрыклад, загінулі са спадзяваннем, што энергія іх фізічных і духоўных пакут не сыдзе разам з імі ў нішто. Персанажам здавалася, што яна павінна хоць неяк адбіцца на сусветных падзеях. Паводле празаікаў, смерць асобнага чалавека не магла скончыць забойства, але момант самапераадолення ўзвышаў асобу, вылучаў яе на фоне канфармісцкай масы.

Аповесці В. Быкава прасякнуты пафасам самаахвяравання-ўзыходжання. З часоў «Жураўлінага крыку» пісьменнік маляваў запамінальную галерэю дзейных асоб на вайне, разважаў пра розныя праявы чалавечай прыроды (ад гераізму да здрадніцтва). Але самым прыцягальным для яго практычна заўсёды заставаўся персанаж, што вызнаваў гуманістычныя каштоўнасці, «вырашаў не быць дрэньню» [1, с. 228].

Дзейныя асобы, створаныя пісьменнікам з ЗША, вызначаліся эвалюцыяй ад выразна акрэсленага індывідуалізму і эгаізму да жадання слугаваць іншаму. М. Каўлі прапанаваў разглядаць лёсы хемінгуэеўскіх герояў як «аспекты адной і той жа асобы, будзе гэта Нік Адамс, ці Фрэдэрык Генры, ці Джэйк Барнс, ці нават Роберт Джордан» [3, с. 250]. Прыгоды персанажа пачаліся ў Мічыгане, дасягнулі першага кульмінацыйнага моманту на мосце пад Капарэта: непадалёк ад яго лейтэнант Генры трапіў у рукі трыбуналу, але пазбегнуў кары, бо кінуўся ў раку. Гэта спецыфічная «асоба» зноў трывала выпрабаванне ў рамане «Па кім звоніць звон». У дадзеным выпадку яна не здаволілася «сепаратным мірам», вытрымала наканаванае і прыняла смерць.

Творчасць В. Быкава і Э. Хемінгуэя – цікавы аб’ект для імагалагічных даследаванняў. Праблема дачынення «свайго – чужога / іншага» хвалявала сусветную пісьменніцкую супольнасць напрацягу ўсяго XX ст. У абодвух празаікаў бясспрэчны вораг атаясамліваўся з немцам-нацыстам ці італьянцам-фашыстам: істотамі, што прыніжалі чалавечую годнасць, пазбаўлялі жыцця, забівалі парасткі свабоды. Далей шляхі мастакоў слова разышліся. Э. Хемінгуэй, напрыклад, у якасці «чужога» разглядаў апалагета асноўных дагматаў «амерыканскай мары», паслядоўнікаў шматлікіх каштоўнасцей-анахранізмаў заходняй цывілізацыі.

В. Быкаў больш разнастайны ў адлюстраванні персанажаў-«іншых». Грамадска-палітычная сітуацыя абумовіла аповед не толькі пра «знешніх» (нацыстаў), але і «ўнутраных ворагаў», увасобленых у вобразах здраднікаў, смершаўцаў, баязліўцаў. Паказальна, што суаднесенасць «свайго-чужога» ў творах пісьменніка мела дынамічны характар. «Варожасць» не з’яўлялася назаўжды навешаным цэтлікам: у залежнасці ад абставін, маральна-этычных

імператываў, выхавання паводзіны дзейных асоб змяняліся, і яны патэнцыяльна маглі пераходзіць з аднаго шэрагу ў другі («Калі хочацца жыць», «Адна ноч», «Мёртвым не баліць»). Мастак слова крытычна ставіўся да спрошчанага ўспрымання дадзенай апазіцыі. Таму, у якасці своеасаблівай епіфаніі, ён уклаў у вусны галоўнага героя аповесці «Трэцяя ракета» наступнае: «Ці мог я за доўгія месяцы ў шпіталі прадбачыць, што мая адплата ворагу заслоніцца ад мяне… подласцю свайго чалавека?.. Я думаў: дабрацца б да немцаў! А ці толькі яны сталі віной нашай бяды! *На колькі ж франтоў суджана змагацца мне – і з ворагамі ў акружэнні, са сволаччу побач… з самім сабой*» (курсіў наш. – *З. Т.*) [2, с. 401].

Праблема міжасабовых узаемаадносін не абмяжоўвалася адлюстраваннем франтавога таварыства і антаганізму «сваіх» і «чужых». У сталай творчасці мастакоў слова распрацавана тэма кахання-трагедыі (напрыклад, Роберт Джордан і Марыя з рамана «Па кім звоніць звон»; Іван Цярэшка і Джулія, аповесць «Альпійская балада»). Пачуццё вымушала персанажаў спазнаць таямніцы ўласнай душы, адказаць на далікатныя пытанні, якія яны шмат часу абыходзілі. Закаханыя абмяркоўвалі не толькі глыбіню і інтэнсіўнасць сваіх эмоцый, сумесную шчаслівую будучыню-мару, якой не наканавана спраўдзіцца, але і надзённыя грамадска-палітычныя праблемы. Непрыкметна героі сталелі, бо яны дзяліліся жыццёвым вопытам (Фрэдэрык Генры – Кэтрын Барклі, раман «Бывай, зброя!»; Змітрок Барэйка – Франя, аповесць «Пакахай мяне, салдацік»).

Творчасць Э. Хемінгуэя, безумоўна, паўплывала на літаратурна-мастацкую спадчыну В. Быкава. Беларускі пісьменнік шчыра распавёў пра гісторыю свайго знаёмства з аповесцямі і раманамі амерыканскага празаіка ў кнізе ўспамінаў «Доўгая дарога дадому». Мастакі слова не прымалі знешняга ўмяшальніцтва ў працу літаратара, выступалі супраць розных форм прыгнёту (асабліва ў таталітарным грамадстве). Творы Э. Хемінгуэя і аповесці В. Быкава яднаюцца выразным антымілітарысцкім пафасам. Пісьменнікі не прапагандавалі ўдзел у вайне, але лічылі яго непазбежным у выпадку, калі размова ішла пра супрацьстаянне фашызму. Апазіцыя «свой-чужы» ўласціва абодвум празаікам, але спадчына В. Быкава вызначаецца больш дэталёвай распрацоўкай дадзенай тэмы. Гэты факт тлумачыцца спецыфікай савецкага грамадска-палітычнага жыцця. Празаікі ўвасобілі сутнасць франтавога братэрства, разгледзелі каханне на вайне як прэлюдыю да чарговай у жыцці персанажаў трагедыі.

Літаратура

1. Быкаў, В. Доўгая дарога дадому / В. Быкаў // Поўны збор твораў. У 14 т. – Т. 8. Мэмуарная проза. – Мн.: Саюз беларускіх пісьменнікаў; М.: ТАА «Выдавецтва “Время”», 2009. – С. 5–425.

2. Быкаў, В. Трэцяя ракета / В. Быкаў // Поўны збор твораў. У 14 т. – Т. 4. Аповесці. – Мн.: Саюз беларускіх пісьменнікаў; М.: ТАА «Выдавецтва “Время”», 2006. – С. 269–404.

3. Каули, М. Папа и отцеубийцы / М. Каули // Дом со многими окнами. – М.: Прогресс, 1973. – С. 244–256.

4. Ernest Hemingway. Selected Letters. 1917 – 1961 / ed. by C. Baker. – The Ernest Hemingway Foundation, 1981. – 948 p.